**УДК 39:314.544.5-053.2(476.5)**

# ПАЛЯВЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ПАДЗВІННЯ ПА ЭТНАГРАФІІ ДЗЯЦІНСТВА (ЛЕТА 2010 ГОДА)

***С.У. АНДРЫЕЎСКАЯ***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***

*На падставе этнаграфічнай літаратуры і дадзеных палявых даследаванняў вывучаюцца традыцыі выхавання і побыту дзяцей насельніцтва беларускага Падзвіння. Адзначаецца, што ў выніку мадэрнізацыі жыццёвага ўкладу адбылася страта некаторых элементаў радзільна-хрэсьбіннага комплексу абрадаў. Для XX стагоддзя характэрны змяншэнне ролі сямейнага выхавання дзяцей, страта часткі народных традыцый. У артыкуле параўноўваюцца традыцыі быту і выхавання ў XIX, XX і XXI стагоддзях. Асноўнымі прынцыпамі сямейнага выхавання з'яўляюцца: цесная сувязь з жыццём, улік узроставых асаблівасцей, непарушнасць і пераемнасць выхаваўчага працэсу. Праведзеныя палявыя даследаванні па этнаграфіі дзяцінства пацвярджаюць гіпотэзу аб рэгіянальных адметнасцях Падзвіння ў традыцыях выхавання і побыце дзяцей. Іх вывучэнне спрыяе паглыбленню этналагічных ведаў.*

**Уводзіны.** Дзяцінства з'яўляецца перыядам актыўнага засваення сацыяльнага вопыту. Перад сучасным грамадствам востра стаяць праблемы ўзаемаадносін пакаленняў, павышэння ролі сям'і ў выхаванні і сацыялізацыі дзяцей, спынення працэсу разбурэння нацыянальных традыцый у сям'і, страты бацькоўскай адказнасці і іншыя, якія істотным чынам уплываюць на псіхічнае, фізічнае і маральнае развіццё дзяцей. Для вырашэння пазначаных праблем варта звярнуцца да народнага вопыту. Этнаграфія дзяцінства даследуе нацыянальна-адметныя рысы выхавання, ролю дзяцей у полаўзроставай структуры грамадства і сям'і, сямейных святах і абрадах, дзіцячы фальклор, што патрабуе правядзення палявых даследаванняў.

У апошнія гады актывізавалася дзейнасць па збіранню дзіцячага фальклора студэнтамі і выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў краіны. Выдадзена некалькі зборнікаў, складзеных з запісаў канца XX – пачатку XXI стагоддзя [1 – 3]. Аднак цікавасць для даследавання ўяўляюць не толькі фальклорныя тэксты, але і бытавыя сямейныя традыцыі, этнапедагагічныя прыёмы і метады выхавання дзяцей. Перспектыўным напрамкам для развіцця этнаграфіі дзяцінства з'яўляецца вывучэнне рэгіянальных асаблівасцей.

**Асноўная частка**

**Характарыстыка методыкі даследавання.** У межах праграмы вывучэння праблем гісторыі і культуры, экалогіі і прыродакарыстання Падзвіння «Полацк-2009» у 2009 – 2010 гадах распрацоўвалася навуковая тэма «Традыцыі выхавання і побыту дзяцей на тэрыторыі беларускага Падзвіння ў кан. XIX – пач. XXI ст.». Па азначанай тэме былі запланаваны і праводзіліся палявыя этнаграфічныя даследаванні. Летам 2010 года экспедыцыі адбыліся ў наступныя раёны: Верхнядзвінскі (в. Нурава, Зялькі, Горкі Боркавічскага сельскага савета); Мёрскі (в. Дарошкавічы, Горкі Туркоўскага сельскага савета, г. Дзісна); Полацкі (в. Заазер'е, Семянец Заазерскага сельскага савета); Расонскі (в. Рудня, Каралі Янкавічскага сельскага савета); Ушачскі (в. Арэхаўна, Федарэнкі Сарочынскага сельскага савета); Чашніцкі (в. Стаўбцы, Ізгародзішча Кашчынскага сельскага савета); Браслаўскі (в. Іказнь, Укля Цяцерскага сельскага савета).

Аналіз атрыманых у экспедыцыі палявых матэрыялаў дазваляе сказаць, што найбольш інфарматыўнай аказалася наступная група рэспандэнтаў – вясковыя жанчыны, што нарадзіліся ў 20 – 30 гадах XX стагоддзя (больш сталы ўзрост сустракаецца рэдка). Больш маладыя ў адносінах да азначанай тэмы характарызуюцца скептычным стаўленнем, ці іх інфармацыя носіць мадэрнізаваны характар (напрыклад, школьныя ўспаміны). Большасць рэспандэнтаў маюць толькі пачатковую (радзей – сярэднюю) адукацыю. Па веравызнанні рэспандэнты падзяляюцца на праваслаўных і католікаў, амаль у роўнай прапорцыі. Малаінфарматыўнай групай па азначанай тэме з'яўляюцца мужчыны. Асноўным стаў метад апытання на падставе складзенай анкеты-апытальніка. Выкарыстоўваўся таксама метад назірання.

**Радзільна-хрэсьбінная абраднасць беларусаў Падзвіння.** Вядома, што народныя традыцыі найбольш трывала захоўваюцца ў тых сферах, якія мала падвержаны мадэрнізацыйным працэсам. Адной з такіх сфер з'яўляецца сямейнае выхаванне дзяцей. Некаторыя прыёмы догляду, элементы побыту і выхавання дзяцей у сем'ях, вопыт народнай медыцыны, захаваліся аж да XXI стагоддзя. Зразумела, што адбылася іх трансфармацыя, рэдукцыя і мадэрнізацыя. Каб прасачыць змены, якія адбываліся ў побыце і традыцыях сямейнага выхавання на працягу пазначанага гістарычнага перыяду, параўнаем класічныя этнаграфічныя апісанні канца XIX – пачатку XX стагоддзя і інфармацыю, атрыманую з успамінаў рэспандэнтаў.

У «Матэрыялах …» П.В. Шэйна [4, с. 3 – 5] радзіны ў Віцебскай губерні апісваюцца наступным чынам. Калі жанчына адчуе пачатак родаў, яна пасылае за бабкай-павітухай. Імкнуцца, каб найменш лю-

дзей ведалі пра пачатак родаў, таму што гэта прыводзіць да павелічэння іх працягласці. Асабліва непажаданым лічыўся прыход чужых людзей, таму часта для нараджэння дзіцяці абіралі нежылое памяшканне: гумно, лазню і інш. Лёс чалавека, яго здароўе, багацце, па народным меркаванні, залежылі ад шматлікіх абставін яго з'яўлення на свет. Мела значэнне любая дробязь: словы і дзеянні маці, бабкі-павітухі, час і месца нараджэння, надвор'е, дзень тыдня і г.д. Таму нараджэнне дзіцяці суправаджалася магічнымі прыёмамі, знаўцай і выканальніцай якіх была бабка-павітуха. Напрыклад, пупавіну хлопчыку рэзалі на дубовай трэсцы, сякеры, каб быў моцны, добры працаўнік, ці на кнізе – каб быў пісьменны, дзяўчынцы – на верацяне, хлебнай лапаце, каб была работніца і г.д. Пасля нараджэння дзіця мылі ў вадзе, куды кідалі бурштын, дробныя манеты (каб быў багаты), лілі некалькі кропель водкі (каб быў моцны), сыпалі свянцоную соль (каб не «сурочылі»), клалі бурачок (каб быў здаровы) і г.д. Дзіця загортвалі ў полкі (пялюшкі), часам у бацькоўскую кашулю (каб паважаў бацьку), клалі на ложак (але не ў калыску, бо туды можна класці толькі пасля хрышчэння). Бабка-павітуха імкнулася не хваліць дзіця (верагодна, каб не «сурочыць»). Калі ў адносінах народжанага што і казалася, то тыпу: «Во ён, паскуднічек, які плюгавенькі! Ніхай ён лепш ляжыць з Хрістом!» [4, с. 4]. За дапамогу бабка звычайна нічога не брала, зрэдку сустракаюцца звесткі, што парадзіха дарыла ёй кавалак палатна, дробныя манеты.

У XX стагоддзі на Падзвінні адбыліся якасныя змены абставінаў нараджэння жанчынай дзіцяці. Калі большасць рэспандэнтак, якія нарадзіліся ў 20-я гады XX стагоддзя адзначаюць, што нараджалі дзяцей дома, то ўжо большасць рэспандэнтак, якія нарадзіліся ў 30-я гады XX стагоддзя адзначаюць, што яны нараджалі дзяцей у медыцынскіх установах. Улічваючы, што перыяд дзетанараджэння першых прыходзіўся на даваенныя, ваенныя і першыя пасляваенныя гады, а апошніх (у большасці) на 50 – 60 гады XX стагоддзя, можна зрабіць выснову, што менавіта ў 60-я гады XX стагоддзя пачаўся працэс страты пласта народнай культуры, звязанага з радзільнай абраднасцю. Зніжаецца статус і паступова цалкам перастае існаваць сацыяльная роля павівальнай бабкі, зніжаецца роля кумоў у жыцці дзіцяці. Аб'ектыўнай прычынай працэсу, безумоўна, было паляпшэнне медыцынскага абслугоўвання, яго даступнасць для насельніцтва нават самых аддаленых ад раённых цэнтраў вёсак.

Істотныя змены ў бок спрашчэння адбыліся ў XX стагоддзі ў радзільна-хрэсьбінным комплексе, што можна прасачыць на падставе ўспамінаў рэспандэнтак. З апісаных этнографамі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя «класічных» для Віцебшчыны радзільнага і хрэсьбіннага абрадаў [4, с. 3 – 36] у другой палове XX стагоддзя захаваліся толькі некаторыя элементы. Рэспандэнткі, якія нараджалі дзяцей дома, адзначалі, што да іх прымаць роды запрашалі мясцовую «бабку», якую ведала ўся акруга. Усе, без выключэння, добра памяталі яе імя (што паказальна). Адразу ж пасля родаў «бабка» ажыццяўляла купанне дзіцяці. Тыя рэспандэнткі, якія нараджалі дзяцей у медыцынскіх установах маглі не памятаць імя ўрача ці акушэркі, якія прымалі роды, але добра памяталі тую жанчыну, якая ажыццяўляла першае купанне дзіцяці дома, больш таго, да яе выбару ставіліся з увагай (што таксама паказальна). Яе і называлі «бабкай». Такая тэндэнцыя заўважаецца ў Полацкім, Ушачскім, Чашніцкім, Расонскім, Верхнядзвінскім раёнах. Такім чынам, калі ў першай палове XX стагоддзя «бабкай» называлі мясцовую «спецыялістку», якая прымала роды, то ў другой палове XX стагоддзя адбылося перанясенне: «бабкай» называлі не тую жанчыну, якая непасрэдна прымала роды, а тую якая першы раз купала дзіця. Пры гэтым па-ранейшаму вясковыя жанчыны лічаць што быць «бабкай» прэстыжна, былі вельмі задаволены, калі іх запрашалі. Ва ўсіх раёнах Падзвіння, дзе праводзілася апытанне, назіраецца сувязь паміж першым купаннем дзіцяці і наданнем жанчыне, якая яго ажыццяўляла, статусу «бабкі»: *«я суседку запрасіла, каб купаць паказала, дык яна майму сыну – бабка. Мы ўжо з ёй бальшая радня»*[1]; *«мы з адной у бальніцы разам ляжалі, яна мяне дужа ўлюбіла, дык запрасіла пакупаць за бабку»*[2]; *«свякроўка мне першага купала, дык яе тады і ў начоўках каталі»*[3]. Ва ўсіх, без выключэння, раёнах «бабка» лічыцца раднёй (хаця б і не знахозілася ў кроўным радстве з парадзіхай), аб чым сведчаць выказванні рэспандэнтак. Частымі з'яўляюцца выпадкі, калі пачэсная роля «бабкі» даставалася маці ці свякроўцы парадзіхі, што лагічна супадала з бытавымі абставінамі (маладая сям'я жыла пад адным дахам з бацькамі). Праслежваецца сувязь радзільна-хрэсьбіннага абраду з сімволікай вады: значнасць першага купання дзіцяці, у час хрэсьбін «бабку» садзілі і вазілі на Падзвінні часцей за ўсё ў *«начоўках»*. У апісаннях XIX стагоддзя бабу возяць на баране. Яна, едучы, аблівала ўдзельнікаў шэсця вадой[3]. У сувязі з гэтым можна выказаць меркаванне аб традыцыйнай функцыі «бабкі» не толькі як павітухі, але і як важнага ўдзельніка «ачышчальных» мерапрыемстваў у радзільна-хрэсьбінным абрадзе (вада як сродак ачышчэння).

---

[1] Запісана аўтарам 21.06.2010 ад Гердовай Людмілы Мацвееўны, 1940 г. н., в. Заазер'е, Полацкі раён.

[2] Запісана аўтарам 13.08.2010 ад Лагчэевай Варвары Сямёнаўны, 1926 г. н., в. Стаўбцы Кашчынскага сельскага савета, Чашніцкі раён.

[3] Запісана аўтарам 25.06.2009 ад Царавай Вацлавы Якубаўны, 1931 г. н., в. Дарошкавічы Туркоўскага сельскага савета, Мёрскі раён.

Па сведчанні рэспандэнтаў, на Падзвінні традыцыйныя элементы радзільнага абраду захоўваліся да пачатку 90-х гадоў XX стагоддзя.

Бадай, самым інфарматыўным аказаўся блок, звязаны з цяжарнасцю (у прыватнасці, перасцярогамі для цяжарных) і хатнімі сродкамі лекавання ад дзіцячых хвароб. Найбольш вядомымі дзіцячымі хваробамі на Падзвінні з'яўляюцца «ўпуд» (*«супуд», «пуд»*) і «ўрок» (*«суроцы», «сурок»*). Амаль кожная рэспандэнтка прапанавала сціранне падалом сарочкі маці «пры суроку» і сплёўванне тры разы пры «ўпудзе» як універсальныя сродкі лекавання. Сярод іншых вядомых з «класічнай» этнаграфічнай літаратуры [4; 5] хваробаў намі зафіксавана інфармацыя пра «начніцы», «крыксы», «рожу» (некалькі відаў), «калтун», «грыжу» (некалькі відаў), «лішай», «наход»[4]. Пы гэтым заўважым, што сярод рэспандэнтаў не было такіх, якія б прызналіся што практыкуюць лячэнне замовамі. Большасць адзначалі, што выкарыстоўвалі народныя прыёмы лекавання ў адносінах сваіх уласных дзяцей. Звычайна апісваліся дзеянні без вербальнага суправаджэння. Напрыклад: ад *«крыксаў»* маці трэба ўзяць малое дзіця ў свой падол і трэсці (*«палоць»*); ад *«начніц»* – пакласці яго на падлогу і венікам каціць ад печы да парога[5]; ад *«упуду»* тры разы абнесці вакол хаты, пацалаваць і сплюнуць, прагаварыўшы: *«Пуд, астанься тут!»*[6]; ад *«лішая»* пацерці па хворым месцы ў дзіцяці вільгаццю з ваконнага шкла і прагаварыць: *«Лішай, ідзі свінням мешай!»*[7] і г.д. Веданне рэспандэнтам народных прыёмаў лекавання залежыць ад таго, ці былі ў яго жыцці сітуацыі, калі яно было неабходна. Гэты пласт народнай культуры носіць латэнтны характар і актывізуецца толькі тады, калі з'яўляецца вострае запатрабаванне. Даследчык павінен улічваць і тое, што не кожны рэспандэнт пажадае адкрыць хоць і маленькія, але ўсёж-такі «сакрэты».

Забароны, звязаныя з цяжарнасцю, наадварот, сакрэтам не лічацца, таму паведамляюць іх рэспандэнткі з задавальненнем. Такіх забарон зафіксавана ў даследуемым рэгіёне некалькі дзесяткаў. Да большасці з іх стаўленне скептычнае, тыя ж, якія лічацца «праўдзівымі», звычайна ў аповедзе падмацоўваюцца прыкладамі з жыцця. У тлумачэннях інфарматараў адносна забарон яскрава праслежваецца ідэя расплаты дзяцей за «грахі» бацькоў. Звычайная схема аповеда простая. Бацька ці маці парушылі ўстаноўлены парадак (напрыклад, нешта рабілі ў свята) – у выніку калецтва ў дзіцяці, звязанае з відам дзейнасці: маці шыла – у дзіцяці сшытыя пальцы рук; бацька сек – у дзіцяці рассечаная губа і г.д. [5].

На наш погляд, цікавасць прадстаўляе забарона на ўдзел цяжарнай жанчыны ў абрадзе хрышчэння ў якасці хроснай маці, як адлюстраванне рэштак архаічных вераванняў, звязаных з цяжарнасцю і душой. У беларусаў лічылася, што ў выпадку шкода будзе нанесена абодвум дзецям.

Трэба адзначыць, што пэўны ўплыў на рэспандэнтаў аказваюць сучасныя сродкі масавай інфармацыі, якія прыносяць у беларускую вёску звесткі аб традыцыях іншых народаў, таму некаторыя з іх носяць эклектычны характар. Акрамя таго, паколькі просьба расказаць, як выхоўвалі дзяцей – гэта фактычна (у разуменні інфарматара) просьба расказаць пра ўсё жыццё, інфармацыя, атрыманая ад рэспандэнтаў, часта змяшчае шмат «лішніх» для тэмы звестак, напрыклад, шмат інфармацыі пра вясельны абрад, успамінаў аб вайне, бытавых здарэннях.

Ва ўсіх даследаваных раёнах Падзвіння лічылася, што быць кумам ці кумой (хросным бацькам, маці) – пачэсна. Пры гэтым большасць рэспандэнтаў адзначалі, што ад кумаўства не адмаўляюцца. Выпадкі запрашэння ў кумы ў XX стагоддзі чужых (выпадковых, прышлых) людзей зафіксаваны толькі ў Браслаўскім раёне. У астатніх выпадках у XX стагоддзі ў кумы запрашалі ці сваякоў, ці сяброў (суседзяў па вёсцы). На Мёршчыне, Верхнядзвіншчыне пераважаюць уяўленні аб тым, што ў кумы трэба запрашаць нежанатых людзей. Ва Ушацкім, Полацкім, Расонскім раёнах гэтая заканамернасць не зафіксавана. Большасць рэспандэнтаў лічаць, што ў кумы можна запрашаць і жанатых сваякой ці сяброў. Паўсюдна распаўсюджана ўяўленне аб тым, што шлюбная пара не можа быць кумамі ў аднаго хросніка адначасова. Лічыцца, што кумамі павінны быць людзі, якія паміж сабой «чужыя», гэта значыць не з'яўляюцца мужам і жонкай. Зафіксавана імкненне маладых дзяўчат удзельнічаць у хрышчэнні хлопчыкаў, якое нібыта спрыяе больш хуткаму заключэнню шлюбу самой хроснай маці[8]. У Чашніцкім раёне большасць рэспандэнтаў

[4] Запісана аўтарам 25.06.2009 ад Царавай Вацлавы Якубаўны, 1931 г. н., в. Дарошкавічы Туркоўскага сельскага савета, Мёрскі раён; 28.06.2010 ад Федарэнка Аліны Сяргееўны, 1939 г. н., в. Федарэнкі Сарочынскага сельскага савета, Ушацкі раён; 15.08.2010 ад Цвіль Вольгі Андрэеўны, 1933 г. н., в. Ізгародзішча Кашчынскага сельскага савета, Чашніцкі раён.

[5] Запісана аўтарам 26.07.2010 ад Каевай Тамары Аркадьеўны, 1939 г. н., в. Нурава, Боркавічскага сельскага савета, Верхнядзвінскі раён.

[6] Запісана аўтарам 24.06.2010 ад Шынкевіч Апалоніі Ігнатаўны, 1915 г. н., в. Іказнь (раней пражывала ў в. Укля Цяцерскага сельсавета), Браслаўскі раён.

[7] Запісана аўтарам 13.08.2010 ад Канапелькінай Таццяны Паўлаўны, 1936 г. н., в. Стаўбцы Кашчынскага сельскага савета, Чашніцкі раён.

[8] Запісана аўтарам 28.06.2010 ад Федарэнка Аліны Сяргееўны, 1939 г. н., в. Федарэнкі Сарочынскага сельскага савета, Ушацкі раён.

сведчыла аб непажаданасці запрашаць у кумы незамужніх дзяўчат (асабліва да дзяўчынак)[9]. Такое меркаванне, магчыма, звязана з архаічнымі вераваннямі аб размеркаванні «долі».

У XIX стагоддзі на Падзвінні быў распаўсюджаны абрад «муравінкі», «змыванне мура», «зліўкі», «жмурынкі». Абрад завяршаў хрэсьбіны і быў абавязковым, бо патрабаваў змыць з немаўляці рэшткі святога міра, якім мазалі дзіця ў царкве. Сутнасць абраду заключалася ў тым, што дзіцяці змывалі вадой твар і ручкі (у некаторых месцах купалі), пасля чаго ў ваду мачылі рукі і мазалі ёй вочы ўсе прысутныя, мяркуючы, што міра аказвае лекавае ўздзеянне [5, с. 387]. Даследчык Е.Р. Раманаў паведамляе, што пры першым купанні дзіцяці ў ваду клалі срэбныя грошы, каб дзіця было «багатым і чыстым, як срэбра». Бабка-павітуха мыла дзіця вадой, куды сыпаўся авёс, каб дзіця не было плаксівым, а было шчаслівым [5, с. 329].

Ні адна з рэспандэнтак (а сярод іх былі і 1915 г.н.) не ведае, што за абрад «муравінкі» («зліўкі» і г.д.), апісанне якога мы сустракаем у «Матэрыялах…» П.В. Шэйна [4, с. 11 – 12] і іншых крыніцах [5], з чаго вынікае, што ў 30-я гады XX стагоддзя гэты абрад ужо не фіксуецца.

Адбітак наклала на народныя традыцыі савецкая антырэлігійная прапаганда, асабліва ва ўсходняй частцы Падзвіння. Больш часта на Расоншчыне, Полаччыне, Ушаччыне (у параўнанні з Мёршчынай, Браслаўшчынай) не хрысцілі дзяцей, не вянчаліся. Прычыну рэспандэнты тлумачылі па-рознаму: адсутнасць паблізу царквы (савецкія ўлады закрывалі храмы), прыналежнасць да партыі камуністаў аднаго члена сям'і, неабходнасць выбару справак з сельсавета аб месцы жыхарства (у савецкія часы святары абавязаны былі дасылаць інфармацыю ў сельсаветы аб правядзенні абрадаў хрышчэння, вянчання), боязь рэпрэсіўных дзеянняў з боку ўлад. Ні адзін з рэспандэнтаў не пазначыў, што не хрысціў дзяцей з-за цвёрдых атэістычных перакананняў, наадварот, падкрэслівалася, што «ў бога веру» (і «іконы ў доме трымаю»)[10], але «жыццёвыя абставіны склаліся так»[11].

**Бытавыя ўмовы выхавання дзяцей.** Уяўленне аб тым, якім павінен быць побыт дзіцяці, змянілася напрацягу апошніх двух стагоддзяў. Прычынай гэтага з'яўляецца не толькі паляпшэнне ўмоў жыцця людзей, але і змена адносінаў да дзіцяці. Калі ў традыцыйным грамадстве сацыяльная вартасць дзяцей была нізкай, то для сучаснага грамадства характэрна ўсведамленне вартасці дзіцяці, каштоўнасці яго як асобы. Таму ў побыце дзяцей адбыліся якасныя змены, ён значна палепшыўся.

У XIX стагоддзі быт дзяцей залежыў ад сацыяльнага і матэрыяльнага становішча іх сям'і. Істотна адрозніваліся пабытовыя ўмовы дзяцей шляхты, гарадской беднаты і сялян. У заможных гараджан і шляхты быў асобны дзіцячы пакой, часам за дзецьмі наглядалі выхавальніцы, няньки. У дзяцей была спецыяльная дзіцячая мэбля, цацкі фабрычнага вырабу, добрае адзенне. У сялянскай хаце асобных пакояў для дзяцей не было. Месцам знаходжання дзяцей лічыліся палаці («пол», «полак»), дзе яны павінны былі сядзець ціха, каб не замінаць бацькам рабіць неабходныя справы, ці весці размову, калі хто заходзіў у хату. Сялянская хата не вылучалася чысцінёй, часта ў падпечку зімой змяшчалі курэй, маладняк жывёлы. Летам хату запаўняла безліч мух. Традыцыйна генеральная ўборка хаты адбывалася перад Вялікднём, Сёмухай, Калядамі [6, с. 105 – 106]. Абавязковым прадметам дзіцячай мэблі ў XIX стагоддзі ў сялян была толькі калыска для немаўлят.

Мала інфармацыі ўдалося атрымаць ад рэспандэнтаў аб прадметах дзіцячай мэблі, цацках, гульнях. Успаміны аб цацках і гульнях у аповедах рэспандэнтаў узнікалі толькі тады, калі з імі было звязана яркае эмацыйнае перажыванне, у астатніх выпадках рэспандэнт пазбягаў тэмы, як нязначнай, не вартай увагі. Паказальная вербальная рэакцыя: *«старая, ужо не памятаю, калі тое было», «ай, якія там цацкі, бедна жылі, трэба было бацькам памагаць»*[12]. У першай палове XX стагоддзя прадметы дзіцячай мэблі (па ўспамінах інфарматараў) былі ў большасці самаробнымі. Толькі з 60 – 70-х гадоў XX стагоддзя шырока распаўсюдзіліся прадметы прамысловай вытворчасці. Такія рэчы, як калыска, «стойка» часта перадавалі з пакалення ў пакаленне ці ад суседа да суседа ў вёсцы. Адзенне для дзяцей у першай палове XX стагоддзя (часцей за ўсё) таксама перадавалася ад старэйшых дзяцей, а для немаўлят яго рабілі з бацькоўскай «старызны». Зафіксаваны цэлы комплекс народных «абгрунтаванняў» такой стратэгіі. У якасці прыкладу прывядзем наступныя: *«Рабёнку трэба дзелаць пялёнкі са старых скацёрак-настольнікаў, тады яго жыццё будзе лёгкае, будзе ўсё жыццё гуляць»*[13]; *«Пялюшкі рабілі са старога, каб адзежа добра насілася»*[14]; *«Рабілі*

---

[9] Запісана аўтарам 15.08.2010 ад Цвіль Вольгі Андрэеўны, 1933 г. н., в. Ізгародзішча Кашчынскага сельскага савета, Чашніцкі раён.

[10] Запісана аўтарам 15.08.2010 ад Цвіль Вольгі Андрэеўны, 1933 г. н., в. Ізгародзішча Кашчынскага сельскага савета, Чашніцкі раён.

[11] Запісана аўтарам 25.06.2009 ад Царавай Вацлавы Якубаўны, 1931 г. н., в. Дарошкавічы Туркоўскага сельскага савета, Мёрскі раён.

[12] Запісана аўтарам 24.06.2010 ад Шынкевіч Апалоніі Ігнатаўны, 1915 г. н., в. Іказнь (раней пражывала ў в. Укля Цяцерскага сельсавета), Браслаўскі раён; 13.08.2010 ад Канапелькінай Таццяны Паўлаўны, 1936 г. н., в. Стаўбцы Кашчынскага сельскага савета, Чашніцкі раён.

[13] Запісана аўтарам 22.08.2010 ад Свірскай Юзэфы Броніславаўны, 1931 г. н., в. Горкі Мікалаеўскага сельскага савета, Мёрскі раён.

[14] Запісана аўтарам 15.08.2010 ад Іўкінай Валянціны Цімафееўны, 1932 г. н, в. Ізгародзішча Кашчынскага сельскага савета, Чашніцкі раён.

*са старога, бо бедна жылі»*[15] і г.д. У 70 – 80-я гады ХХ стагоддзя бацькі імкнуцца набываць для дзіцяці новую адзежу, незалежна першанец гэта ці не. У першую чаргу змена стратэгіі была звязана з ростам дабрабыту. Цікава, што і такая стратэгія нарадзіла шмат абгрунтаванняў у народнай свядомасці: *«каб дзіця не хварэла, трэба апранаць ва ўсё новае», «на хрышчэнне трэба новае адзяваць абавязкова»* [16].

**Сродкі і метады выхавання.** Сэнс выхавання ў традыцыйнай беларускай сям'і заключаецца ва ўмацаванні пераемнасці пакаленняў на аснове традыцый. Можна пагадзіцца з даследчыцай Л.В. Ракавай аб тым, што паняцце «выхаванне» адрозніваецца ў навуковым і народным разуменні. На падставе аналізу актавых дакументаў XVI – XVII стагоддзяў яна прыходзіць да высновы, што пад выхаваннем у сем'ях беларусаў разумелася не толькі мэтанакіраванае педагагічнае ўздзеянне на асобу дзіцяці, але і забеспячэнне яго ўсім неабходным: жыллём, адзеннем, ежай [6, с. 176]. Такое разуменне тэрміна «выхаванне» дайшло да нашага часу, найбольш дакладна сэнс сямейнага выхавання перадаюць народныя выразы «гадаваць», «узгадаваць», «выгадаваць дзяцей».

Значнае месца ў размове з кожным рэспандэнтам адведзена працоўнаму выхаванню: падрабязнаму аповеду пра тое, што дапамагалі рабіць яны сваім бацькам, да якой працы прывучалі ўласных дзяцей. У сялянскай сям'і, якая з'яўлялася гаспадарчай адзінкай, была вялікая патрэба ў рабочых руках. Таму ўсе дзеці разглядаліся не як абуза, а як памочнікі, сяляне змалку прывучалі дзяцей да працы. Гэта адбывалася паступова, у залежнасці ад узросту дзіцяці. Ужо пяці-шасцігадовыя дзеці мелі абавязкі – ім даручаліся нескладаныя гаспадарчыя работы: падмесці ў хаце, на двары, пільнаваць агарод ад курэй, пасвіць гусей, глядзець за малодшымі. Абавязкам дзяцей было збіранне ягад, грыбоў, выпас жывёлы. Ранняе ўключэнне дзяцей у працу характэрна для традыцыйнага грамадства многіх народаў. У беларусаў Падзвіння панавала перакананне, што ўсе *«павінны працаваць з малых гадоў»*. Сярод рэспандэнтаў распаўсюджана меркаванне аб тым, што варта дзяцей прывучаць да працы, каб яны маглі дасягнуць дабрабыту, багацця ў дарослым жыцці. Частай матывацыяй ранняга ўключэння дзяцей у сялянскую працу з'яўлялася беднасць сям'і, шматдзетнасць, хвароба аднаго з дарослых членаў сям'і (ці яго смерць) і г.д. *«Мамка мая дужа хварэла, дык я малая, гадоў у восем і карову даіла, і есці варыла»*[17]. Працалюбства лічылася важнай якасцю, што падымала прэстыж сям'і ці асобнага чалавека. Сяляне імкнуліся развіваць матывацыю працы ў дзяцей *(«ніякай працы не баяліся»)*, інтуітыўна яны разумелі, што гэтага можна дасягнуць праз гульню і заахвочвалі гульні з цацкамі, сярод якіх пераважалі прадметы хатняга ўжытку, прылады працы. Працоўнаму выхаванню спрыялі і імітацыйныя гульні, у якіх узнаўляліся працоўныя аперацыі. Ёсць шмат беларускіх народных танцаў, што паўтараюць працоўныя аперацыі. З ранняга дзяцінства дзецям унушалася, што праца не толькі крыніца існавання, але і апірышча ў жыцці («рамяство за плячамі не насіць»). Працоўныя традыцыі складваліся стагоддзямі і няўхільна падтрымліваліся ў сям'і. Па словах П.В. Шэйна, з 10 – 12 гадоў падлетак актыўна ўключаўся ў выкананне сельскагаспадарчых мужчынскіх абавязкаў (касіў, араў), да гэтага, з 6 – 7 гадоў, ён выконваў абавязкі пастуха [4]. Многія з рэспандэнтаў, дзяцінства якіх прайшло ў першай палове ХХ стагоддзя, узгадваюць аб раннім уключэнні ў працу.

Здольнасць дзяўчыны ці хлопца да працы ўлічвалася пры выбары жаніха ці нявесты. *«Добрая дзеўка была, і прасці, і ткаць умела, усю сям'ю абшывала…»*[18]. У беларусаў на працягу некалькіх стагоддзяў дзейнічаў прынцып «як бацькі нашы працавалі, так і мы працаваць будзем», характэрны для традыцыйнага аграрнага грамадства, які адлюстроўваў кансерватызм мыслення старэйшага пакалення [6, с. 239]. Для другой паловы ХХ стагоддзя, як адзначаюць даследчыкі, характэрны змены: вопыт папярэдніх пакаленняў адрозніваўся ад сучаснага і адбываўся разрыў паміж традыцыйнай свядомасцю і жыццёвымі рэаліямі. Так, напрыклад, павышаецца роля адукацыі ў грамадстве. Па сведчанні этнографаў XIX стагоддзя, сяляне з неахвотай аддавалі дзяцей вучыцца, бо не бачылі для іх іншай долі, акрамя працы на зямлі. Але ў другой палове ХХ стагоддзя нават для сялян становіцца відавочным, што адукацыя – адзін з «сацыяльных ліфтаў» (сродак «выбіцца ў людзі»). Таму яны імкнуцца даць дзецям хаця б пачатковую адукацыю. Падмацоўвала гэтую тэндэнцыю палітыка савецкай улады, накіраваная на ўвядзенне ўсеагульнай пачатковай, а потым і сярэдняй адукацыі.

З пашырэннем усеагульнай сярэдняй адукацыі назіраецца яшчэ адна тэндэнцыя ХХ стагоддзя – зніжэнне выхаваўчай ролі сям'і. Большую частку часу дзеці праводзяць у школе, што ўплывае на працэсы іх сацыялізацыі. Калі для традыцыйнага грамадства XIX – пачатку ХХ стагоддзя важнейшымі асярод-

[15] Запісана аўтарам 21.06.2010 ад Гердовай Людмілы Мацвееўны, 1940 г. н., в. Заазер'е, Полацкі раён.

[16] Запісана аўтарам 21.06.2010 ад Гердовай Людмілы Мацвееўны, 1940 г. н., в. Заазер'е, Полацкі раён.

[17] Запісана аўтарам 24.06.2010 ад Шынкевіч Апалоніі Ігнатаўны, 1915 г. н., в. Іказнь (раней пражывала ў в. Укля Цяцерскага сельсавета), Браслаўскі раён.

[18] Запісана аўтарам 13.08.2010 ад Канапелькінай Таццяны Паўлаўны, 1936 г. н., в. Стаўбцы Кашчынскага сельскага савета, Чашніцкі раён.

камі сацыялізацыі была сям'я і аднавяскоўцы, то для другой паловы XX стагоддзя іх уплыў на працэс сацыялізацыі дзяцей змяншаецца за кошт школы, дзяржавы, якая актыўна ўмешваецца ў выхаванне.

Адносна асаблівасцей рэлігійнага выхавання ў сем'ях беларусаў Падзвіння канца XIX – пачатку XX стагоддзя можна адзначыць наступныя тэндэнцыі: калі ў дарэвалюцыйны перыяд рэлігійнаму выхаванню надавалася значная ўвага на ўзроўні дзяржавы (царкоўна-прыходскія школы), то пасля рэвалюцыі рэлігійнае выхаванне цалкам залежыць ад сямейнай традыцыі. Для тэрыторыі Падзвіння асаблівасцю з'яўляецца наяўнасць прадстаўнікоў розных канфесій (праваслаўныя, католікі і інш.), што спарадзіла талерантнае стаўленне да суседзяў-іншаверцаў, якое выхоўвалася ў дзяцей. Напрыклад, рэспандэнты неаднаразова падкрэслівалі, што іх сям'я не планавала працу ў рэлігійнае свята суседзяў іншай канфесіі, каб не пакрыўдзіць рэлігійныя пачуцці апошніх. Акрамя таго, нярэдкімі былі шлюбы паміж прадстаўнікамі *«розных вераванняў»*. Трэба ўлічваць і размежаванне Падзвіння да 1939 года на ўсходнюю і заходнюю часткі. Моцная пазіцыя каталіцкага касцёла на заходніх тэрыторыях да 1939 года адбілася ва ўспамінах рэспандэнтаў. Так, адна з жыхарак Браслаўшчыны ўзгадвае, што калі дзяўчына-каталічка выходзіла замуж за праваслаўнага, то ў касцёле званы званілі, нібыта па мёртвай[19]. Увогуле рэспандэнты-католікі часцей за рэспандэнтаў праваслаўнага веравызнання ўзгадвалі пра рэлігійнае выхаванне дзяцей у іх сем'ях. Для савецкіх часоў характэрна адмоўнае стаўленне дзяржавы да рэлігіі. Аднак большасць рэспандэнтаў адзначалі, што ў сем'ях захоўваліся рэлігійныя традыцыі. Перш за ўсё праявай захавання традыцый было імкненне большасці ахрысціць дзяцей (часам для гэтага ехалі ў іншы населены пункт, раён), выканаць пахавальны абрад з запрашэннем святара.

Асноўнымі сродкамі выхавання, якімі карысталіся ў сем'ях беларускага Падзвіння з'яўляліся: народныя традыцыі, праца, звычаі і абрады, вусна-паэтычная творчасць. Выкарыстоўваліся такія метады выхавання, як ухваленне, прыклад бацькоў, аўтарытэт, заахвочванне. Нярэдка інфарматары ўзгадвалі аб славесных усчуваннях і фізічных пакараннях з боку сваіх бацькоў. У дадзеным выпадку трэба памятаць, што выхаваўчы працэс у сялянскай сям'і ўплецены ў само жыццё, размова з рэспандэнтам не з'яўляецца тым метадам, які яго ў поўнай ступені зафіксуе. Напрыклад, калі папрасіць суразмоўцу ўзгадаць якую-небудзь прымаўку пра бацькоў і дзяцей, то ён, хутчэй за ўсё, гэтага не зможа. У натуральных жа абставінах такое ўзгадваецца само сабой, таму мэтазгодна сумяшчаць метад апытання і назірання.

На наш погляд, цікавыя некаторыя прыклады фальклорных тэкстаў для дзяцей, якія захаваліся да пачатку XXI стагоддзя і якія ўдалося зафіксаваць. Вось адзін з Верхнядзвінскага раёна[20]:

*Гоп, гоп, і – га – га!*
*Едзець Янка на Буланке,*
*Паўтараста рублёў санкі!*
*Гоп – гоп, і – га – га!*

Важнейшымі сродкамі традыцыйнага выхавання былі прыказкі, прымаўкі, пажаданні, загадкі і іншыя жанры вуснай народнай творчасці. Жыхары Падзвіння незалежна ад сацыяльнага і ўзроставага стану ўжывалі іх у паўсядзённым жыцці, прымяркоўваючы да зручнага моманту. Галоўнай іх мэтай было развіццё ў дзіцяці лепшых якасцей, што дасягалася зручнай для запамінання формай [6, с. 181]. У XX стагоддзі значная частка беларускіх фальклорных тэкстаў, прызначаных для дзяцей, выходзіць з ужытку, іх замяняюць творы мастацкай літаратуры. Асноўнай установкай выхавання было разуменне эфектыўнасці ранняга ўздзеяння на дзіця: *«вучы дзіця, пакуль ляжыць упоперак лаўкі, а не ўздоўж»*[21] і інш.

Вусная народная творчасць служыла сродкам дапасавання дзяцей да народнай традыцыі [7; 8, с. 80]. Яго эфектыўнай рэалізацыі садзейнічаў удзел дзяцей у сямейных абрадах, святах каляндарнага цыкла. Таму асноўнымі прынцыпамі сямейнага выхавання з'уляюцца: цесная сувязь з жыццём, улік узроставых асаблівасцей, непарушнасць і пераемнасць выхаваўчага працэсу.

**Заключэнне.** Палявое даследаванне пацвердзіла меркаванне аб рэгіянальных адметнасцях Падзвіння ў традыцыях выхавання і побыце дзяцей. Іх вывучэнне спрыяе паглыбленню этналагічных ведаў. Традыцыі выхавання і ўмовы побыту дзяцей на тэрыторыі Падзвіння на працягу канца XIX – пачатку XXI стагоддзя зазналі значныя змены. Яны цесна ўплецены ў само жыццё, таму іх эвалюцыя адбылася адначасова са зменамі ў грамадстве і побыце беларусаў. Адметнасці ў выхаваўчых сямейных традыцыях і побыце дзяцей на Падзвінні абумоўлены кліматычнымі, ландшафтнымі, гістарычнымі асаблівасцямі развіцця рэгіёну. За пазначаны гістарычны перыяд адбываюцца змены ў сямейных традыцыях, звязаных з нараджэн-

[19] Запісана аўтарам 24.06.2010 ад Шынкевіч Апалоніі Ігнатаўны, 1915 г. н., в. Іказнь (раней пражывала ў в. Укля Цяцерскага сельсавета), Браслаўскі раён.

[20] Запісана аўтарам 08.07.2009 ад Антонавай Ніны Векентьеўны, 1946 г. н., в. Перапечкі, Верхнядзвінскі раён.

[21] Запісана аўтарам 23.08.2010 ад Ляшкевіч Анастасіі Фадзееўны, 1935 г. н., в. Горкі Мікалаеўскага сельскага савета, Мёрскі раён.

нем дзяцей. Антырэлігійная палітыка і прапаганда, перасяленне моладзі ў гарады ў XX стагоддзі спрыялі знікненню, спрашчэнню радзільна-хрэсьбіннай абраднасці.

Для XX стагоддзя характэрна зніжэнне ролі сямейных традыцый у выхаваўчым працэсе, на што паўплывалі такія фактары, як перанясенне асноўнай ролі ў выхаванні дзяцей на школу, інтэнсіўныя працэсы ўрбанізацыі, малая ўвага дзяржавы да захавання этнічных традыцый. У сувязі з гэтым у XX стагоддзі адбываецца страта часткі фальклорных тэкстаў, звязаных з выхаваннем дзяцей. У сем'ях беларусаў Падзвіння найбольш трывала захаваліся да канца XX – пачатку XXI стагоддзя традыцыі працоўнага і рэлігійнага выхавання дзяцей. Асноўныя сродкі і метады выхавання, характэрныя да больш ранняга перыяду, працягваюць ужывацца ў беларускіх сем'ях.

Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў (тэма ДБ 0829).

ЛІТАРАТУРА


1. Дзіцячы фальклор Віцебшчыны ў сучасных запісах: дапаможнік / склад. А.С. Емельянаў, Г.П. Харошка. – Віцебск: Выд-ва УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2007. – 200 с.
2. Дзіцячы фальклор: зб. фальклорных матэрыялаў / рэд. кал.: У.А. Васілевіч (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДПУ, 2006. – 359 с.
3. Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / Т.В. Валодзіна [і інш.]; навук. рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 439 с.
4. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / собр. и приведена в порядок П.В. Шейном. – СПб.: Императорская академия наук, 1887. – Т. 1. Ч. 1: Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – 585 с.
5. Романов, Е.Р. Белорусский сборник / Е.Р. Романов. – Вильно: Б. м., 1912. – Вып. 8: Быт белоруса. – 600 с.
6. Ракава, Л.В. Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX – XX стст. / Л.В. Ракава. – Мінск: Беларус. навука, 2009. – 311 с.
7. Этналогія Беларусі: традыцыйная культура насельніцтва ў гістарычнай перспектыве. Вучэбна-метадычны дапаможнік / Т.А. Навагродскі. – Мінск: БДУ, 2009. – 335 с.
8. Сямёнава, В. Выхаванне ў беларускай сям'і: этнапедагогіка / В. Сямёнава // Адукацыя і выхаванне. – 1999. – Вып. 4. – С. 79 – 88.


*Паступіў 16.11.2010*

**FIELD INVESTIGATIONS OF THE DVINA REGION ON ETNOGRAPHY OF THE CHILDHOOD (SUMMER 2010)**

***S. ANDRYEWSKAJA***

*In this article on the basis of the ethnographic literature and facts of the field investigations are studied traditions of bringing up and way of life of the belarussian population of the Dvina region. It is marked, that the results of modernisation of the way of life caused loss of some elements of maternal-baptismal complex of ceremonies. For the XX ht century it is typical the reduction of role of the family bringing up of children on the basis of folk traditions. In the article are compared traditions of the way of life and bringing up in the XIX th, XX th and XXI st centuries. Field investigations, made by the author prove the hypothesis about regional peculiarities of the Dvina region.*